# КРУГЛЫ СТОЛ З УДЗЕЛАМ ПРАДСТАЎНІКОЎ ЗАМЕЖНЫХ ДЭЛЕГАЦЫЙ

**НАВУКА Ў СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ**

Стрийський коледж Львівського НАУ

22 верасня 2017 года ў рамках супрацоўніцтва паміж установамі адукацыі па запрашэнні Стрыйскага каледжа Львоўскага нацыянальнага аграрнага ўніверсітэта дэлегацыя ад Пружанскага каледжа ўзяла ўдзел у паседжанні круглага стала на тэму «Інавацыйная культура выкладчыка».



У склад дэлегацыі увайшлі: **Козел С.М.** –дырэктар УА "Пружанскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж», **Миляшевич С.І.** – намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, **Дудко М.В.** – загадчык аддзялення «Аграномія», **Карунас М.В.** – загадчык аддзялення «Энергетычнае забеспячэнне сельскагаспадарчай вытворчасці», **Куліч Ю.М.** – майстар вытворчага навучання.



Акрамя прадстаўнікоў Стрыйскага і Пружанскага каледжаў удзел у круглым стале бралі прадстаўнікі каледжа з Польшчы: **Ян Чычэрскі** – дырэктар Суполкі эканамічна-тэхнічных школ у Раковіцах Вялікіх, і яго намеснік— **Якуб Кушнірэк**.



Удзельнікі круглага стала выступалі з дакладамі на тэмы: «Асаблівасці фарміравання інавацыйнай культуры выкладчыка», «Новая ўкраінская школа", "Інавацыйныя працэсы ў выкладанні замежнай мовы», «Прафесійны рост выкладчыка».

Круглы стол прайшоў у атмасферы плённага супрацоўніцтва. Кіраўнікі каледжаў дамовіліся аб заключэнні трохбаковага дагавора з мэтай арганізацыі супрацоўніцтва як выкладчыкаў па іх інавацыйнай дзейнасці, так і навучэнцаў.

***Карунас М.В., загадчык аддзялення «Энергетычнае забеспячэнне сельскагаспадарчай вытворчасці»***


| | | |
|---|---|---|
| Насценгазета «Весці ПДАТК»<br>**№50, верасень 2017**<br>Выдаецца аб'яднаннем па інтарэсах «Журналістыка» ўстановы адукацыі «Пружанскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж» | **Галоўны рэдактар:**<br>Янушкевіч М.А.<br>**Матэрыялы падрыхтавалі:**<br>Папко В.Д., Сітко А.А., Бучалка У.А, Канавега Н.А., Казлоўскі Д.І., Гардзей В.Г. Карунас М.В., Парфіновіч Л.Л. (фота ) | **Наш адрас:**<br>вул. Чырвонаармейская, 11, 225133<br>г. Пружаны Брэсцкай вобл.,<br>тэл./факс (801632) 21478<br>e-mail: ubeley@tut.by, college@brest.by |